СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛЮТАГА 2017 г. АЎТОРАК № 25 (28389)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Арыентаваць бізнес на ЕАЭС**



**Чаму навука і эканоміка — часткі цэлага**



**Румынія — еўрапейскі тыгр?**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4 млрд 927,2 млн**

*у эквіваленце склалі па стане на 1 лютага золатавалютныя рэзервы Беларусі. У 2016 годзе ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду яны павялічыліся на $751,4 млн. За студзень золатавалютныя рэзервы выраслі на $57,8 млн пасля росту ў снежні 2016 года на $88,9 мільёна. Павелічэнню золатавалютных рэзерваў у студзені садзейнічала паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў Беларусі абліграцый, намінаваных у замежнай валюце, купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама паступленні ад спагнання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.02.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9121 ▼ |
| Еўра | 2,0557 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0701 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СТАЛІЧНЫ «ЦЯГНІЧОК»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аматары катання на каньках і ў марознае надвор'е не ўпускаюць шанцаў — прыходзяць на Чыжоўскае вадасховішча, што ў сталіцы.

■ У цэнтры ўвагі

## ЭВАЛЮЦЫЯ, А НЕ РЭВАЛЮЦЫЯ

### Тэрмін навучання ў магістратуры будзе вызначацца сумесна з заказчыкам кадраў

**«Па сутнасці, мы павінны сёння вызначыцца са стратэгічнымі прыярытэтамі, шмат разоў усё ўзважыць, каб зразумець, наколькі будзе апраўдана ўнясенне ў Кодэкс аб адукацыі тых ці іншых дапаўненняў і карэкціровак», — такую думку выказала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА на семінары-нарадзе, які арганізавала для дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі кіраўніцтва Міністэрства адукацыі.**

Як ужо паведамлялася раней, да 1 ліпеня Кодэкс аб адукацыі плануецца ўнесці на разгляд у парламент. Па словах **міністра адукацыі Ігара КАРПЕНКІ**, работа над яго праектам уступіла ў завяршальную стадыю: «Каб прыняцце законапраекта прайшло як мага хутчэй і, галоўнае, каб канчатковы дакумент атрымаўся максімальна якасным, ён ужо сёння выносіцца на грамадскае абмеркаванне — магчымасць выказацца ёсць ва ўсіх. Спадзяюся, што наша супрацоўніцтва акажацца максімальна плённым...»

### Каб не рыхтаваць «паўфабрыкаты»...

— Мы проста абавязаны ўлічваць сусветныя тэндэнцыі хоць бы таму, што знаходзімся ў цэнтры Еўропы, а суседнія краіны актыўна рэфармуюць свае сістэмы адукацыі. Заставацца закрытымі пры наяўнасці адкрытай эканомікі немагчыма. Але ў нас ёсць перавагі: мы можам аналізаваць досвед іншых, вучыцца на чужых памылках і не дапускаць сваіх. Трэба не дапусціць любых гвалтоўных пераўтварэнняў, — падзялілася сваім бачаннем Ірына Старавойтава. — Рэформы ў сістэме адукацыі эфектыўныя толькі тады, калі яны не супярэчаць эканамічным законам і прынцыпам і накіраваныя на ўзмацненне яе сацыяльнай і культуралагічнай ролі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК** таксама лічыць, што бяздумная ломка сістэмы адукацыі можа прывесці да небяспечных наступстваў.

СТАР. 4

■ Перспектыва

## НЕ АЗІРАЮЧЫСЯ НА ГЕНПЛАН

### Перад планаваннем капітальнага рамонту лепш загадзя пацікавіцца аб магчымай канфіскацыі вашага ўчастка

**Гэта сапраўды не зразумела, калі жыхарам асобных масіваў прыватнага сектара населеных пунктаў было катэгарычна забаронена паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы, бо чыноўнікі ў нейкіх там планах прапісалі, што іх зямля будзе ў перспектыве выкарыстоўвацца па іншым прызначэнні. А вось на практыцы часта атрымлівалася так, што час ідзе і нічога не мяняецца, а людзі працягваюць жыць у дамах без рамонту, бо на паперах існуе верагоднасць магчымага зносу іх пабудоў. Аднак у такім падвешаным стане людзі жыць ужо не жадаюць...**

СТАР. 3

